**УДК 94(476)"1921/1939"** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-69-1-51-55**

# ПЫТАННЕ ПЕРСАНАЛЬНАГА АБМЕНУ ВА ЎЗАЕМАДАЧЫНЕННЯХ БССР І ПОЛЬШЧЫ Ў 1921–1939 ГГ.

***канд. гіст. навук, дац. В.М. БАРОЎСКАЯ***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***
***ORCID: http://orcid.org/0000-0001-7164-7432***

*У артыкуле акцэнтуецца ўвага на пытанне персанальнага абмену ва ўзаемадачыненнях БССР і Польшчы ў 1921–1939 гг. Падкрэсліваецца, што пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора пытаннямі двухбаковага абмену насельніцтвам займалася спецыяльна створаная Змешаная камісія па рэпатрыяцыі з цэнтрамі ў Варшаве і Маскве. У жніўні 1924 г. пытанне аб персанальным абмене стала часткай дыпламатычных зносін Польшчы і СССР. Праблемамі рэпатрыяцыі стала займацца, у прыватнасці, Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы і Польскае бюро пры ЦК РКП(б)-ЦК УКП(б). Былі таксама зроблены спробы ажыццявіць абмен зняволенымі праз ваенныя ўлады. Указваецца, што згодна з "Дагаворам аб персанальным абмене паміж Польшчай, Расіяй (Беларуссю) і Украінай", заключаным у сакавіку 1923 г., прадугледжвалася ажыццяўленне найбольш буйнога абмену па колькасці асоб, якія падлягалі персанальнаму абмену паміж бакамі.*

***Ключавыя словы:*** *персанальны абмен, БССР, Польшча, Прадстаўніцтва Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, Заходняя Беларусь.*

**Уводзіны.** Пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора пытаннямі двухбаковага абмену насельніцтвам (польскі бок, перш за ўсё, цікавіўся выдачай прадстаўнікоў каталіцкага духавенства, супрацоўнікаў II аддзела Войска Польскага (разведка), савецкі – членаў Камуністычнай партыі Польшчы (КПП), дыверсантаў, разведчыкаў) займалася спецыяльна створаная Змешаная камісія па рэпатрыяцыі з цэнтрамі ў Варшаве і Маскве. Пасля ліквідацыі гэтай камісіі справамі абмену з восені 1924 г. пачалі займацца консульскія службы. Актывізацыі справы садзейнічалі Польскае бюро пры ЦК РКП(б) (Польбюро), а пасля прадстаўніцтва – Камуністычная рабочая партыя Польшчы (КПРП (з 1925 г. – КПП)) пры УЦВК (Польсекцыя).

Пытанне персанальнага абмену паміж БССР і Польшчай у 1921–1939 гг. знаходзіць сваё адлюстраванне ў рамках даследавання В. Матэрскага [1] і падрыхтаванага ім асобнага зборніка дакументаў і матэрыялаў [2]. У польскай гістарыяграфіі неабходна адзначыць напрацоўкі Ф. Складоўскага [3]. У айчыннай гістарычнай навуцы, на жаль, да гэтага часу не было праведзена комплекснага асэнсавання пытання персанальнага абмену паміж беларускім і польскім бакамі. Крыніцавая база будуецца на аснове матэрыялаў, размешчаных у сховішчах Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

**Асноўная частка.** У перыяд з 1919 г. па 1932 г. адбылося 10 персанальных абменаў СССР і Польшчы; у Польшчу выехала больш за 60 ксяндзоў. 21–26 сакавіка 1923 г. у Маскве адбыўся судовы працэс над 15 каталіцкімі служкамі (Я. Цэпляк, А. Малецкі, К. Будкевіч, А. Васілеўскі, П. Януковіч, С. Эйсмант, Э. Юневіч, Т. Матуланіс, Л. Хвецка, Я. Тройга, П. Хадневіч, Д. Іваноў, Л.Фёдараў, Ф. Руткоўскі, А. Праскеціс, Я. Шарнас), абвінавачаных у "контрэвалюцыйнай дзейнасці ў інтарэсах сусветнай буржуазіі". Я.Ф. Цапляк быў прыгавораны да смяротнага пакарання, якое пасля было заменена на 10 гадоў пазбаўлення волі. 9 красавіка 1924 г. быў вызвалены з турмы і высланы ў Польшчу. Па гэтай справе быў расстраляны ксёндз К.Р. Буткевіч (1867–1923). Створаная контрэвалюцыйная арганізацыя ставіла сваёй мэтай супрацьдзеянне дэкрэту аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і інструкцыі аб парадку правядзення ў жыццё гэтага дэкрэта.

1 лютага 1923 г. у Маскве быў заключаны дагавор паміж Польшчай і СССР на персанальны абмен. Савецкі бок атрымоўваў 317 чалавек, у сваю чаргу польскі бок – 617 чалавек. 16 сакавіка 1923 г. быў падпісаны "Дагавор аб персанальным абмене паміж Польшчай, Расіяй (Беларуссю) і Украінай"[1], згодна з якім прадугледжваўся абмен на 340 чалавек ад кожнага з бакоў. У лісце паўнамоцнага прадстаўніка Польшчы ў РСФСР Р. Кноля да дырэктара Дыпламатычнага дэпартамента МЗС Польшчы С. Кентшыньскага адзначалася, што "праследванне каталіцызму з'яўляецца формай самаабароны савецкага боку ад польскай інтрыгі, менавіта таму польскае кіраўніцтва змяніла тактыку ў гэтай справе, не перастала цікавіцца навінамі, аднак змясцілі вектар у бок Ватыкану". У справе Я. Цэпляка польскі бок, па-першае, не верыў у верагоднасць правядзення смяротнага прыгавору ў жыццё, па-другое, не разглядаў магчымасць правядзення персанальнага абмену паміж савецкім і польскім кіраўніцтвам [2, s. 91–92].

У маі 1923 г. міністр замежных спраў Польшчы М. Сейда на форуме расійска-ўкраінскай часткі Змешанай камісіі па рэпатрыяцыі выказаўся за неабходнасць прыступіць да хуткай рэалізацыі шырокага абмену палоннымі. НКЗС, у сваю чаргу, накіраваў у свае інстанцыі інфармацыю аб спыненні прыняцця кандыдатур на абмен 1 чэрвеня 1923 г., а выезд астатніх планавалася ажыццявіць да 1 верасня 1923 г. Пра гэта было праінфармавана пасольства Польшчы ў Маскве. Аднак ужо на пасяджэнні Змешанай камісіі ў чэрвені 1923 г. канчатковым тэрмінам прыняцця

---

[1]Dziennik Ustaw RP. – 12.IV.1923. – № 38. – S. 249.

кандыдатур на абмен было вызначана 1 лістапада 1923 г. На перагаворах у жніўні савецкі бок прызнаў спіс “317” неактуальным, а палякі патрабавалі выдачы 100 асоб са спісаў “317”, “6”, “18” і “50(51)”. Такім чынам, намеціліся вострыя рознагалоссі паміж Варшавай і Масквой па гэтым пытанні.

20 верасня 1923 г. на пасяджэнні Савета Міністраў Польшчы былі зацверджаны спісы асоб, якія падлягалі двухбаковаму абмену, згодна з “Дамовай аб рэпатрыяцыі” 24 лютага 1921 г.: прадугледжваўся зварот у Польшчу з тэрыторыі РСФСР, УССР і БССР 386 чалавек, у сваю чаргу, 119 чалавек павінны былі вярнуцца з Польшчы ў РСФСР, УССР. Гэты абмен адбываўся пры ўдзеле польскай і расійска-ўкраінскай дэлегацыі Змешанай камісіі па рэпатрыяцыі. Асобы былі падзелены на тры катэгорыі: I – тыя, хто падлягаў першачарговаму абмену ў прапорцыі 1:1 з атрыманнем афіцыйнай згоды (складаннем пратаколу з подпісам) таго або іншага чалавека; II – другасная ступень абмену, III – асобы, у абмене якіх бакі былі зацікаўлены ў апошнюю чаргу. У будучым абмен удалося працягнуць. 26 красавіка 1924 г. у абмен на 107 чалавек, атрыманых польскім бокам, савецкі бок атрымаў 33 чалавекі. Пры гэтым два чалавекі з савецкага спісу адмовіліся выехаць у СССР, а адзін збег з заключэння.

Улады БССР правялі прапагандысцкае мерапрыемства ў сувязі са святочнай сустрэчай камуністаў, што прыбылі па абмене. Яе кульмінацыяй было пасяджэнне Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў з удзелам гэтых асоб, якое праходзіла “пад знакам моцных антыпольскіх акцэнтаў, а таксама абвінавачванняў у праследванні палітычных зняволеных”. 18 сакавіка 1924 г. быў абвешчаны Днём палітычнага зняволенага. У Варшаве таксама публічна віталі палякаў, якія вярнуліся з СССР.

У жніўні 1924 г. пытанне аб персанальным абмене стала часткай дыпламатычных зносін Польшчы і СССР. Праблемамі рэпатрыяцыі стала займацца, у прыватнасці, Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы. Былі таксама зроблены спробы ажыццявіць абмен зняволенымі праз ваенныя ўлады. Актыўна абмяркоўваўся польскі спіс “317”, з якога неабходна было выключыць савінкоўцаў і самога Б.В. Савінкава, якія перашлі на савецкі бок. 12 жніўня 1925 г. адбылося пасяджэнне Міністэрства працы і сацыяльнай апекі па тэхнічных і арганізацыйных аспектах абмену палоннымі. Арганізацыяй абмену займаўся таксама II Аддзел Генеральнага штаба Войска Польскага [2, s. 163–165]. 26 жніўня 1924 г. адбылася міжміністэрская нарада па справе персанальнага абмену паміж Польшчай і СССР[2].

31 снежня 1924 г. адбылася савецка-польская канферэнцыя ў справе персанальнага абмену “67–208” быў вызначы час і месца абмену, канчаткова зацверджаны спісы. Ноччу з 31 студзеня на 1 лютага 1925 г. на ст. Коласава на чыгуначным пераездзе адбыўся абмен па спісу “67–208”. У Мінску быў арыштаваны епіскап Б. Слоскан і іншыя служкі. У той жа час савецкі бок цікавіўся камуністамі, членамі Беларускай сялянскай работніцкай грамады (БСРГ). 3 студзеня 1928 г. адбыўся абмен “9–31”. Савецкі бок атрымаў 9 асоб, узамен 31 польскага палітычнага зняволенага[3]. У жніўні 1932 г. былі прынятыя два апошніх спіса персанальнага абмену. Было вырашана, што польскі бок дадаткова атрымае ксяндза Т. Скальскага. 3 жніўня 1932 г. у Польшчу прыехалі 18 ксяндзоў. Праходзілі таксама перамовы аб выездзе сем’яў палонных, які быў дазволены ў пачатку 1933 г.

Згодна з прапановай міністра замежных спраў Польшчы А. Скшыньскага ў палітычны камітэт Савета Міністраў Польшчы ад 5 снежня 1924 г. была разгледжана справа абмену ксяндза Б.М. Усаса, члена польскай дэлегацыі ў Змешанай спецыяльнай камісіі. Улічваючы дасягненні Б.М. Усаса ў справе вяртання культурных каштоўнасцей і бібліятэчных рарытэтаў у Польшчу, у тым ліку, бібліятэчных збораў князёў Залускіх, уздымалася пытанне яго абмену (ксёндз быў абвінавачаны ў злачынстве за сэксуальнае дамаганне да няпоўналетніх, прыгавораны да 10 год турэмнага зняволення). Сярод кандыдатур, якія маглі выступіць у якасці асоб, падлягаючых абмену, узгадваюцца С. Баран (асуджаны на 4 гады за дзяржаўную здраду, арганізацыю антыдзяржаўнага супрацiўлення пры падтрымцы іміграцыйнага ўрада В.Ю. Ластоўскага, дапамозе Літве), С. Вальдэнберг (член РКП(б), КРПР, арыштаваны за камуністычную дзейнасць)[4].

Справа ў тым, што 29 сакавіка 1925 г. павінен быў адбыцца персанальны абмен паміж СССР і Польшчай на ст. Коласава (недалёка ад Стаўбцоў). Польскі бок абменьваў членаў КПП – В. Багінскага і А. Вечаркевіча. 2 жніўня 1923 г. яны былі арыштаваны па абвінавачванні ў камуністычнай дзейнасці і арганізацыі выбухаў у красавіку і маі 1923 г. у розных польскіх гарадах. Першапачаткова былі прыгавораны да смяротнага пакарання, аднак пасля прэзідэнт Польшчы С. Вайцэхоўскі замяніў яго на пажыццёвае зняволенне. Савецкі бок, у сваю чаргу, абменьваў юрыста, былога польскага консула ў Грузіі І. Лашкевіча з жонкай і дочкамі, і каталіцкага святара Б. Усаса, якіх раней арыштавалі па падазрэнні ў антысавецкай дзейнасці і ўтрымлівалі ў Лубянскай турме ў Маскве. Аднак абмен не адбыўся, бо адзін з ахоўцаў (Ю. Мурашка) забіў В. Багінскага і А Вечаркевіча.

Гэтая падзея стала штуршком для арганізацыі і правядзення шэрагу мітынгаў па ўсёй тэрыторыі БССР з выказваннем пратэсту і “абурэння” дзеяннямі польскіх улад. Хоць да канца не было зразумела: была гэта спланаваная акцыя польскіх спецслужб, або праява асабістай варожасці ахоўніка да арыштаваных. Так, працоўныя г. Слуцка ў колькасці 5200 чалавек удзельнічалі ў такім мітынгу, дзе адзначалася, што забойства з’яўляецца “бясконцай подласцю і мярзотай польскіх паноў”, заяўляўся гучны пратэст супраць нявіданых злачынстваў і накіроўвалася прывітанне ўсім барацьбітам рэвалюцыі і вязням капітала”[5]. А на мітынгу працоўных і служачых

---

[2]Archiwum aktów nowych (AAN). MZS. Wardelpol. Sygn. 12674. – K. 118–121
[3]AAN. PRM. Sygn. 63. –K. 581–585.
[4]AAN. PRM, PP KP RM. – K. 116–118
[5]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 6. Воп. 1. Спр. 195. Арк. 174.

г. Мозыра нават заяўлялася, што “забойства было ажыццяўлена наўмысна і з ведама польскага ўраду праз сваіх агентаў і пры дапамозе ППС, а таму мы патрабуем ад свайго ўраду прыняцця адпаведных мераў супраць такога гвалтоўнага незаконнага зверскага акту”[6]. У тэлеграме ад працаўнікоў міліцыі і пракуратуры ДПУ Слуцкай акругі да ЦВК БССР А.Р. Чарвякову ў снежні 1924 г. указвалася: “дасылаем пралетарскае прывітанне нашым закардонным братам, якія знаходзяцца ў турмах буржуазіі за справу вызвалення ад прыгнёту паноў. Няхай нашыя браты не маркоцяцца, мы прыслухоўваемся да іх стогнаў і ў патрэбную хвіліну працягнем братскую руку. Дасылаем праклёны прыгнятальнікам, спадзяемся, што святкаванне сёмай гадавіны Савецкай Беларусі, слупы, якія аддзяляюць нас адзін ад аднаго, будуць знесены на край прорвы”[7].

Праблема забойства Багінскага – Вечаркевіча была закранута ў польскім сейме дэпутатам ад ППС Н. Барліцкім 2 красавіка 1925 г. Яна характарызавалася як праява анархіі і няздольнасці органаў дзяржаўнай бяспекі забяспечыць абарону правоў польскіх грамадзян. Выказвалася патрабаванне наказаць адказных за гэтае злачынства. У той жа дзень паступіла нота народнага камісара замежных спраў СССР Г.В. Чычэрына пасланніку Польшчы ў СССР С. Кентшыньскаму. У ёй выказваліся пратэст супраць дзеянняў польскага боку, надзея, што ў “наступны раз польскі ўрад прыме ўсе неабходныя меры для папярэджвання паўтору такога выпадку”. 22–24 кастрычніка 1925 г. у акружным судзе Навагрудка Ю. Мурашка быў прыгавораны да двух гадоў турэмнага зняволення з залікам шасці месяцаў папярэдняга заключэння [4, с. 387].

3 красавіка 1925 г. адбылася размова члена калегіі Народнага камісарыята замежных спраў (НКЗС) СССР С.І. Аралава з пасланнікам Польшчы ў СССР С. Кентшыньскім. Падчас яе была ўзнята праблема негатыўнага стаўлення да дыпламатычнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы і асабіста да П.Л. Вайкова ў польскім друку. Гэта было звязана з забойствам каля ст. Коласава В. Вечаркевіча і А. Багінскага. 6 красавіка 1925 г. паступіла нота пасланніка Польшчы ў СССР С. Кентшыньскага народнаму камісару замежных спраў СССР Г.В. Чычэрыну па гэтай справе. Выказвалася шкадаванне, што персанальны абмен асобамі не адбыўся. Пры гэтым адзначалася, што вырашылася пытанне аб устанаўленні адказнасці і меры пакарання за забойства Багінскага – Вечаркевіча [4, с. 395]. 1 мая 1925 г. быў накіраваны зварот Цэнтральнага Савета прафесійных саюзаў БССР і І Усебеларускай нарады па працы прафсаюзаў у вёсцы да страйкуючых сельскагаспадарчых рабочых Польшчы. 8 мая 1925 г. было падрыхтавана прывітанне ІІ Усебеларускай канферэнцыі Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МАПР) палітычным заключаным Беластока [4, с. 396].

З прамовы народнага камісара замежных спраў СССР Г.В. Чычэрына на ІІІ Усесаюзным з’ездзе Саветаў аб знешняй палітыцы савецкага ўраду пра пытанне аб савецка-польскіх адносінах адзначалася, што “артыкул Рыжскага дагвора, які забяспечваў нацыянальным меншасцям магчымасць культурнага развіцця, застаецца ў Польшчы мёртвай літарай”. У пачатку ліпеня 1925 г. адбыўся пераход праз савецка-польскую мяжу падпаручыка 1-й роты 4-га батальёна корпуса памежнай аховы Ф.Ф. Манцынскага.

Дамова паміж Польшчай і СССР аб вырашэнні памежных канфліктаў была падпісана ў Маскве 3 жніўня 1925 г. у асобе С.І. Аралава, члена калегіі НКЗС СССР, і С. Кентжыньскага, надзвычайнага пасланніка і паўнамоцнага міністра Польшчы, “у мэтах усталявання, па магчымасці, спрошчанага парадку вырашэння канфліктаў гаспадарча-бытавога характару, якія ўзнікаюць на мяжы” [4, с. 406]. Гэтая дамова вырашала дробныя памежныя канфлікты і інцыдэнты (адзінкавае абстрэльванне тэрыторыі ці памежнай аховы іншага боку без ахвяр), а таксама памежныя канфлікты гаспадарчага характару. Яны павінны былі вырашацца начальнікамі адпаведных памежных атрадаў ДПУ (СССР), старастамі адпаведных памежных паветаў. Калі абодва бакі не прыйшлі да паразумення на мясцовым узроўні, то пытанні выносіліся на ўзровень адказнасці Народнага камісарыята замежных спраў (НКЗС) і Міністэрства замежных спраў.

13 снежня 1926 г. была прынята “Пастанова Савета Міністраў Польшчы аб абмене палітычнымі зняволенымі паміж Польшчай і СССР”. На аснове закона ад 16 сакавіка 1923 г. Савет Міністраў Польшчы атрымаў паўнамоцтвы на складанне спісу 340 асоб, якія знаходзяцца ў Польшчы і падлягаюць выдачы СССР у абмен на асоб польскага паходжання, якія знаходзяцца на тэрыторыі СССР. Савету Міністраў перадавалася таксама кампетэнцыя ў справе прыпынення судовай, адміністрацыйнай, дысцыплінарнай і інш. адказнасці ў адносінах да асоб, прадугледжаных для абмену. У выніку, на аснове гэтай пастановы польскі ўрад павінен быў выдаць СССР 9 асоб у абмен на 32 асобы, пераданыя Польшчы. Абмен адбыўся на ст. Коласава 3 студзеня 1928 г. Ужо 6 студзеня 1928 г. газета “Звезда” паведамляла аб прыбыцці ў Мінск Ф. Гжэльшчака-Гжэгажэўскага, С. Мартэнса-Скульскага і іншых былых палітычных зняволеных і іх ад’ездзе ў Маскву [4, с. 387–388].

Згодна з запісам у дзённіку міністра ўнутраных спраў Польшчы Ф. Славой-Сладкоўскага ад 24 ліпеня 1929 г. адносна пытання персанальнага абмену з савецкім бокам, адзначалася негатыўнае стаўленне Ю. Пілсудскага да гэтай справы [3, s. 71]. З сярэдзіны 1930-х гг. пасольства Польшчы ў Маскве і консульскія прадстаўніцтвы ў СССР хадайнічалі аб персанальным абмене, але гэтыя спробы прывялі толькі да паляпшэння ўмоў утрымання зняволеных. Гэтыя дзеянні ажыццяўляліся главой Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску В. Аконьскім у адносінах да ксяндзоў В. Кунды і В. Тамашэўскага. У верасні 1932 г. адбыўся абмен паміж СССР і Польшчай вялікімі групамі палітзняволеных. Абмен адбыўся на савецка-польскай мяжы, на ст. Коласава, у 40 км на захад ад Мінска.

[6]Там жа. Арк. 229.
[7]НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 624. Арк. 23.

З савецкага боку пры абмене прысутнічалі адказны супрацоўнік НКЗС В.Г. Якаўлеў і прадстаўнік Чырвонага Крыжа ў Польшчы С. Семпалоўская[8].

15 верасня 1932 г. 40 чалавек былі падрыхтаваныя для передачы СССР Польшчай. Быў заключаны пратакол, дзе вызначаліся дакладная колькасць асоб, падлягаючых абмену, час і месца абмену. З польскага боку яго падпісалі ўпаўнаважаны па персанальным абмене В. Кулікоўскі, саветнік польскай дыпламатычнай місіі ў Маскве А. Панінскі, з савецкага – загадчык І Заходняга аддзела НКЗС М.Я. Раівід[9]. На савецкую зямлю прама з турмы ўступіла 40 дзеячаў Камуністычнай партыі і нацыянальна-вызваленчага руху Польшчы, сярод іх: члены ЦК КПП – Я. Пашын, К. Цыхоўскі, Т. Жарскі; відныя дзеячы КПЗБ – Я.С. Бабровіч, М.Л. Правалоцкі, А.М. Розеншайн (Р. Максімоўскі), Л.Г. Шайкоўскі, В.З. Харужая, Р.Х. Гелер, С.А. Клінцэвіч, В. Фрышман, М.М. Словік. Сярод абмененых знаходзіліся таксама былыя кіраўнікі разгромленай БСРГ і дэпутацкай фракцыі “Змаганне”, дэпутаты польскага сейма П.П. Валошын, І.С. Дварчанін, І.Е. Гаўрылік, П.С. Крынчык, Ф.І. Валынец. М.С. Арэхва, член КПЗБ, дырэктар школы Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) у Мінску ў 1932 г. ва ўспамінах адзначаў, што “па ўсім маршруце ад мяжы да Мінску на кожным прыпынку іх сардэчна віталі і закідвалі кветкамі жыхары мясцовых вёсак. У Мінску на прывакзальнай плошчы, а потым у Доме культуры адбылася святочная сустрэча прадстаўнікоў грамадскасці гораду з абмененнымі польскімі рэвалюцыянерамі, якая вылілася ў дэманстрацыю пралетарскай салідарнасці”[10].

Усе дзеячы КПЗБ і беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пасля адпачынку і лячэння былі выкарыстаны на адпаведнай працы. Я. Бабровіч і В. Фрышман – у Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры БАН. Я. Бабровіч у сааўтарстве з Багданскім напісаў брашуру “Аб класавай барацьбе ў Заходняй Беларусі падчас Беларускай сялянска-работніцкай грамады”, а В. Фрышман – манаграфію “Прамысловасць Заходняй Беларусі”. В.З. Харужая (пад імем А. Шыпшына) – “За Чырвоны Кастрычнік у Заходняй Беларусі” і Р.Х. Гелер (пад імем К. Ткачынскі) – “Як і што змагаюцца беластокскія тэкстыльшчыкі” – былі выкарыстаны ў працы рэдакцыі. М. Словік займаўся школай КПЗБ, а пасля стаў членам тройкі Прадстаўніцтва КПЗБ у Мінску. М.Л. Правалоцкі і Л.Г. Шайкоўскі былі накіраваны на вучобу ў Камуністычны ўніверсітэт нацыянальных меншасцей у Маскве. С. А. Клінцэвіч – на працу з ЦК МАПРа БССР, А.М. Розеншайн (Максімоўскі) стаў рэдактарам польскай газеты органа ЦК УКП(б) “Трыбуна Радзецка”. І.С. Дварчанін як філолаг працаваў у Беларускай акадэміі навук, І.Е. Гаўрылік – членам калегіі Народнага камісарыята асветы, Ф.І. Валынец – сакратаром ЦК МАПРа БССР. П.С. Крынчык знаходзіўся на лячэнні. С.А. Рак-Міхалоўскі працаваў дырэктарам Беларускага дзяржаўнага гістарычнага музея. Што датычыцца Б.А. Тарашкевіча, то пасля датэрміновага вызвалення ў красавіку 1930 г. з польскай турмы ён перайшоў на нелегальнае становішча і выкарыстоўваўся на заданнях ЦК КПЗБ. Пасля другаснага арышту ў лютым 1931 г. быў асуджаны на 8 год турмы і толькі ў верасні 1933 г. па абмену выехаў у СССР. Працаваў у Міжнародным аграрным інстытуце ў Маскве, загадваў аддзелам Польшчы і Прыбалтыкі.

**Заключэнне.** Пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора пытаннямі двухбаковага абмену насельніцтвам (польскі бок, перш за ўсё, цікавіўся выдачай прадстаўнікоў каталіцкага духавенства, супрацоўнікаў ІІ аддзела Войска Польскага (разведка), савецкі – членаў КПП, дыверсантаў, разведчыкаў) займалася спецыяльна створаная Змешаная камісія па рэпатрыяцыі з цэнтрамі ў Варшаве і Маскве. Пасля ліквідацыі гэтай камісіі справамі абмену з восені 1924 г. пачалі займацца консульскія службы. Актывізацыі справы садзейнічалі Польскае бюро пры ЦК РКП(б) (Польбюро), а пасля прадстаўніцтва – КПРП (з 1925 г. – КПП) пры УЦВК (Польсекцыя). Ступень эфектыўнасці персанальнага абмену знаходзілася ў прамой залежнасці ад агульнага становішча савецка-польскіх адносін. Агульная зацікаўленасць у паспяховасці абменнага працэсу прымушала абодва бакі шукаць прымальныя шляхі вырашэння спрэчных момантаў. Нават зрывы ў механізме персанальнага абмену (інцыдэнт на савецка-польскай мяжы, звязаны з забойствам А. Вечаркевіча і В. Багінскага), не сталі прычынай адмовы ад гэтага сродку камунікацыі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Materski W. Pobocza dyplomacji. Wymiana więźniów politycznych pomiędzy II Rzeczypospolitą a Sowietami w okresie międzywojennym. – Warszawa: Inst. Studiów Polit. PAN, 2002. – 320 s.
2. Wymiana więźniów politycznych pomiędzy II Rzeczypospolitą a Sowietami w okresie międzywojennym: Dokumenty i materiały / Oprac. Materski W. – Warszawa: Inst. Studiów Polit. PAN, 2000. – 294 s.
3. Składkowski F. Strzępy meldunków. – Warszawa, 1988. – 117 s.
4. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – М., 1965. – Т. 4: апрель 1921 г. – май 1926 г. – 560 с.

*Паступіў 09.08.2023*

[8]НАРБ. Ф. 976. Воп. 1. Спр. 73. Арк. 139-141.
[9]Архіў знешняй палітыкі расійскай Федэрацыі (АЗП РФ). Ф. 09. Оп. 3а. Папка 1. Спр. 136. Арк. 30–32.
[10]НАРБ. Ф 976. Воп. 1. Спр. 72. Арк. 23.

## ВОПРОС ПЕРСОНАЛЬНОГО ОБМЕНА ВО ВЗАИМООТНОШЕНИЯХ БССР И ПОЛЬШИ В 1921–1939 ГГ.

***канд. ист. наук, доц. О.Н. БОРОВСКАЯ***
***(Институт истории НАН Беларуси, Минск)***

*Статья посвящена вопросу персонального обмена во взаимоотношениях БССР и Польши в 1921–1939 гг. Подчеркивается, что после заключения Рижского мирного договора вопросами двустороннего обмена населением занималась специально созданная Смешанная комиссия по репатриации с центрами в Варшаве и Москве. В августе 1924 г. вопрос персонального обмена стал частью дипломатических отношений между Польшей и СССР. В частности, проблемами репатриации стали заниматься МВД Польши и Польское бюро при ЦК РКП(б)-ЦК УКП(б). Предпринимались также попытки осуществить обмен пленными через военные власти. Указывается, что согласно «Договору о персональном обмене между Польшей, Россией (Белоруссией) и Украиной», заключенному в марте 1923 г., предусматривалось осуществление наиболее крупного обмена по числу лиц, подлежащих обмену между сторонами.*

***Ключевые слова:*** *персональный обмен, БССР, Польша, Представительство Коммунистической партии Западной Беларуси, Западная Беларусь.*

## THE ISSUE OF PERSONAL EXCHANGE IN RELATIONS BETWEEN THE BSSR AND POLAND IN 1921-1939

***O. BOROVSKAYA***
***(Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*The article focuses on the issue of personal exchange in the relations between the BSSR and Poland in 1921-1939. It is emphasized that after the conclusion of the Riga Peace Treaty, the issues of bilateral population exchange were dealt with by a specially created Joint Commission for Repatriation with centers in Warsaw and Moscow. In August 1924, the issue of personal became part of diplomatic relations between Poland and the USSR. In particular the Ministry of Internal Affairs of Poland and Bureau under the Central Committee of the RCP (b)-Central Committee of the All-Russian Communist Party (b) began to deal with the problems of repatriation. Attempts were also made to effect an exchange of prisoners through the military authorities. It is indicated that according to the "Treaty on personal exchange between Poland, Russia (Belarus) and Ukraine" concluded in march 1923, the implementation of the largest number of persons subject to personal exchange between the parties was envisaged.*

***Keywords:*** *personal exchange, BSSR, Poland, Representation of the Communist Party of Western Belarus, Western Belarus.*